BELARUS Live
NEWSLETTER
22/02-28/02/08

**ПАЛІТЫКА**
▪ЗША й Эўропа чакаюць канчатковага вызваленьня А. Казуліна

**АФІЦЫЙНА**
▪Праект Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы гатовы
▪У Беларусі будзе скарочаны час тэрміновай службы

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Аляксандар Казулін сустрэўся з амбасадарамі некаторых эўрапейскіх краінаў
▪Франак Вячорка спадзяецца пазьбегнуць прызыву ў войска

**ЭКАНОМІКА**
▪Дзяржава вырашыць, колькі прадпрымальнік павінен плаціць сваім працаўнікам

**ГРАМАДЗТВА**
▪Недахоп лекараў і мэдсёстраў у сталіцы
▪50 тысяч подпісаў у абарону свабоды сумленьня

**КУЛЬТУРА**
▪Падсумаваньне вынікаў конкурсу да 450-годзьдзя Льва Сапегі Тэкст

Самым напружаным сюжэтам у грамадзка-палітычным жыцьці Беларусі цягам апошніх дзён стала сытуацыя вакол палітыка Аляксандра Казуліна і ягонай сям'і.

Казулін быў абвінавачаны ў арганізацыі масавых беспарадкаў і асуджаны на пяць з паловай гадоў зьняволеньня ў калёніі строгага рэжыму пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году, на якіх ён выступаў у якасьці аднаго з кандыдатаў. Многія палічылі, што такім чынам Казулін паплаціўся за жорсткую крытыку дзейнага кіраўніка дзяржавы.

Сёньня Казуліна называюць "беларускім зьняволеным №1". Пасьля таго як цягам мінулых тыдняў былі датэрмінова вызваленыя некалькі чалавек, якіх Захад і беларускае незалежнае грамадзтва лічаць вязьнямі сумленьня, канчатковае вырашэньне праблемы палітзьняволеных затармазілася менавіта на асобе Казуліна. Між тым менавіта поўнае вырашэньне гэтай праблемы Захад называе папярэдняй умовай для наладжваньня дыялёгу з афіцыйным Менскам.

23 лютага памерла жонка палітыка Ірына Казуліна, якая хварэла на рак. Паводле закону, Аляксандру Казуліну мусілі даць водпуск працягласьцю да сямі дзён без уліку дарогі. Але ўлады марудзілі трое сутак, перш чым дазволілі выезд з калёніі на тры дні.

Аналітыкі адзначаюць, што ў гэтай сытуацыі кіроўная вярхоўка выбрала самы няўдалы нават у чыста палітычным сэнсе варыянт паводзінаў, ня кажучы ўжо пра маральны бок справы.

У прыватнасьці, была магчымасьць поўнага вызваленьня Казуліна пад маркай трагічных абставінаў. Гэта дазволіла б уладзе забіць двух зайцоў: і захаваць твар у ейным разуменьні ("мы не паддаліся заходняму ціску, а толькі выявілі гуманнасьць"), і адначасна набраць пунктаў у вачох Эўразьвязу ды Вашынгтону.

Была таксама магчымасьць даць "зьняволенаму №1" водпуск адразу, без аніякіх умоў ды цяганіны. Тады б, ва ўсякім разе, не было б хвалі грамадзкага пратэсту і адпаведных заяваў з боку міжнародных інстытуцыяў.

У выніку ж улада саступіла пад унутраным і міжнародным ціскам пасьля таго, як Казулін і дзьве ягоныя дочкі абвесьцілі галадоўку, пахаваньне было адкладзенае, у краіне пачаліся

акцыі салідарнасьці, ва ўнісон ім выказалася замежжа. Нават апалітычны электарат быў непрыемна ўражаны амаральнасьцю паводзінаў улады.

На думку незалежных назіральнікаў, дзяржаўнае кіраўніцтва за гэтыя некалькі дзён істотна падпсавала свой імідж нават у вачох прыхільнікаў. Прычынамі такіх паводзінаў кіроўнай вярхоўкі называюцца страх перад асобай Казуліна, які зарэкамэндаваў сябе адчайнымі палітычнымі крокамі, і нежаданьне "паказаць слабіну" перад электаратам.

Зь іншага боку, адзначаюць аналітыкі, тое, што ў выніку адбылася саступка, сьведчыць ня толькі пра дзейснасьць міжнароднага ціску ды пратэстаў у самой краіне, але і пра ўзмацненьне шэрагу іншых небясьпечных для ўлады чыньнікаў. Найперш гаворка ідзе пра лятэнтны эканамічны ды палітычны наступ з боку Расеі і агульнае пагаршэньне эканамічнага стану. Як адзначалася на калегіі МЗС Беларусі 27 лютага, адмоўнае сальда беларускага замежнага гандлю летась дасягнула 2 мільярдаў 750 мільёнаў даляраў.

Інфляцыя за 2007 год склала 12,1%, амаль што ўдвая перасягнуўшы плянавы паказчык. Рост спажывецкіх цэнаў працягваецца і сёлета: толькі за студзень яны ўзьняліся на 2,5%. Блізкія да ўраду крыніцы паведамляюць пра падрыхтоўку дакумэнту аб новым павышэньні закупачных цэнаў на малако і мяса, што неўзабаве прывядзе і да падаражаньня гэтых прадуктаў у крамах.

Такія пагрозьлівыя для дзяржаўнага кіраўніцтва варункі падвышаюць ягоную зацікаўленасьць у наладжваньні стасункаў з Захадам дзеля прытоку інвэстыцыяў, пошуку энэргетычных альтэрнатыў і г.д. Такім чынам, у Брусэлю ды Вашынгтону зьяўляюцца пэўныя шанцы ўзьдзейнічаць на "апошнюю дыктатуру Эўропы", лічаць незалежныя аналітыкі.

Разам з тым яны перасьцерагаюць заходніх палітыкаў ад эйфарыі.

Па-першае, зазначаюць экспэрты, ва ўладаў пакуль што так і не хапіла духу канчаткова вызваліць Казуліна. На думку некаторых, ён застаецца ў руках прэзыдэнта Лукашэнкі "казырнай картай", якую прытрымліваюць "на потым". Сам Казулін на прэсавай канфэрэнцыі 28 лютага перад вяртаньнем у калёнію выказаў меркаваньне, што ня будзе вызвалены ва ўсякім разе да 25 сакавіка. Гэта найважнейшая дата ў апазыцыйным календары мае назву Дня волі і заўжды адзначаецца масавымі акцыямі ў гонар угодкаў утварэньня ў 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспублікі, якую апазыцыя лічыць вяхой у паўставаньні дзяржаўнасьці, а афіцыйны бок называе "марыянэткавай".

Па-другое, на думку экспэртаў, нават вызваленьня ўсіх палітвязьняў недастаткова для таго, каб палітычная атмасфэра ў краіне зьмянілася. Бо ў заканадаўстве застаецца шэраг рэпрэсіўных артыкулаў, якія могуць быць скарыстаныя дзеля крымінальнага перасьледу паводле палітычных матываў. А выбарчае заканадаўства і асабліва практыка ягонага прымяненьня, што нагадвае гульню ў адныя вароты, практычна не пакідае апанэнтам улады шанцаў на парлямэнцкіх выбарах, што пройдуць найхутчэй 28 верасьня.

---

## ПАЛІТЫКА

## ЗША й Эўропа чакаюць канчатковага вызваленьня А. Казуліна

**У заяве Дзярждэпартамэнту ЗША выказваюцца спадзяваньні на датэрміновы й канчатковы выхад на волю Аляксандра Казуліна, а таксама спачуваньні ў сувязі са сьмерцю яго**

**жонкі Ірыны — чытаем на сайце „Нашай Нівы”.**

Як заявіў прэсавы сакратар амэрыканскага дзяржэпартамэнту Том Кейсі, "вельмі важна, каб вызваленьне Казуліна было канчатковым". Калі ж палітвязьня вызваляць датэрмінова, то "ЗША будуць гатовыя пачаць дыялёг зь Беларусьсю адносна далейшых крокаў па паляпшэньні двухбаковага супрацоўніцтва".

За сытуацыяй, якая адбываецца ў Менску, уважліва сочыць і Эўразьвяз.

Безумоўнага вызваленьня Аляксандра Казуліна патрабавалі сябры Камітэту па міжнародных справах Эўрапарляманту на чале са старшынём Яцэкам Сарыюшам-Вольскім. Яны, аднак, назвалі абуральным і антыгуманным тое, што цягам двух дзён пасьля сьмерці жонкі Казуліну не дазвалялі паехаць на пахаваньне.

## АФІЦЫЙНА

### Праект Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы гатовы

**Праект Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы, у прынцыпе, гатовы для разгляду на Вышэйшым дзяржаўным савеце — заявіў у размове з карэспандэнтам БелТА старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Вадзім Папоў.**

"Мяркую, што пасьля выбараў, якія пройдуць у Расеі, і інаўгурацыі прэзыдэнта зьявіцца магчымасьць абмеркаваць напрацаваны праект дакумэнту", — дадаў сьпікер.

У выпадку калі ВДС адобрыць дакумэнт, то ў Беларусі й Расеі адначасова павінен прайсьці рэфэрэндум — сваю пазыцыю выкажа народ.

Вадзім Папоў дадаў, што "калі ВДС палічыць неабходным прапрацаваць варыянт прэзыдэнцкага кіраваньня, то камісія гатова яго разгледзець".

### У Беларусі будзе скарочаны час тэрміновай службы

**Час тэрміновай службы ў беларускім войску будзе скарочаны, заявіў міністар абароны Беларусі Леанід Мальцаў у адказе на пытаньні журналістаў.**

Адначасова міністар зазначыў, што пераходзіць на кантрактную службу войска ня будзе.

Леанід Мальцаў заявіў, што тэрмін вайсковай службы плянуецца з паўтара году зьменшыць да аднаго году. На дадзены момант асобы без вышэйшай адукацыі служаць 1,5 году, з вышэйшай — 1 год.

Міністар абароны таксама паведаміў, што ў 2007 годзе на ўзбраеньне ў Беларусі было выдаткавана 1,33% ад ВУП.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Аляксандар Казулін сустрэўся з амбасадарамі некаторых эўрапейскіх краінаў

**Аляксандар Казулін сустрэўся ўчора зь некаторымі амбасадарамі эўрапейскіх краінаў — пацьвердзіў Польскаму радыё былы адвакат палітвязьня Ігар Рынкевіч. Аднак А. Казулін пра падрабязнасьці гэтых сустрэчаў не паведамляе.**

Ігар Рынкевіч: Гэтыя сустрэчы адбыліся, нягледзячы на тое што сустрэчы грамадзкага пляну меркавалася праводзіць у чацьвер. Але паколькі былі ўзгодненыя пэўныя кантакты, то адбыліся сустрэчы зь некаторымі амбасадарамі. Аднак пра гэта Аляксандар Казулін пакуль не даваў інфармацыі.

### Франак Вячорка спадзяецца пазьбегнуць прызыву ў войска

**Франак Вячорка спадзяецца пазьбегнуць прызыву ў войска. Актывіст партыі БНФ зьвязвае сваё адлічэньне з ВНУ з прызыўной кампаніяй, якая неўзабаве адбудзецца.**

Ф. Вячорка: Зараз я праходжу мэдычныя агляды. Прызыўная кампанія пачынаецца

ў сакавіку, і ўсё можа быць. Я мяркую, што ўсё было заплянавана: мяне ў студзені пасадзілі, а з-за адседкі выгналі з унівэрсытэту. Упэўнены, што ваенкамат ужо рыхтуецца ўручыць мне павестку. Таму ня выключаю нічога й рыхтуюся да найгоршага, але не пакідаю змаганьняў. Найменш за ўсё хачу выглядаць ахвярай.

Згодна зь беларускім заканадаўствам, мужчыны, якія дасягнулі 18 гадоў й не атрымліваюць адукацыю ў вышэйшых навучальных установах, маюць абавязак прайсьці вайсковую службу.

## ЭКАНОМІКА

### Дзяржава вырашыць, колькі прадпрымальнік павінен плаціць сваім працаўнікам

**Міністэрства па падатках і зборах прапануе перагледзець мінімальны ўзровень заработнай платы, якую наймальнік павінен выплачваць свайму працаўніку.**

Па словах намесьніка міністра па падатках і зборах Беларусі Васіля Каменкі, сустракаюцца выпадкі, калі зарплата ніжэй за пражытачны мінімум або наагул не выдаецца. Ведамства падрыхтавала праект адпаведнага дакумэнту, які ўводзіць мінімальную суму зарплаты, якую павінен выплаціць індывідуальны прадпрымальнік свайму працаўніку, і адказнасьць за невыкананьне гэтага патрабаваньня.

## ГРАМАДЗТВА

### Недахоп лекараў і мэдсёстраў у сталіцы

**У Менску бракуе лекараў і мэдсёстраў. Пра гэта ішла гаворка падчас круглага стала пра важнасьць станаўленьня сямейнай мэдыцыны ў рэспубліцы. У сыстэме паліклінік не хапае 400 лекараў — як вузкіх спэцыялістаў, так і тэрапэўтаў. Найбольш дэфіцытныя спэцыялісты — траўматолягі, хірургі, эндакрынолягі. Запатрабаваньне на такіх спэцыялістаў удвая большае, чым колькасьць працаўладкаваных лекараў.**

На працягу апошніх гадоў выпускнікі Менскага мэдычнага ўнівэрсытэту пераважна застаюцца працаваць у сталіцы, але прэстыж працы ў паліклініках даволі нізкі, і неабходныя дадатковыя меры, каб прыцягнуць туды спэцыялістаў.

Згодна з рашэньнем Менгарсавету, для некаторых мэдыкаў уведзеная даплата ў памеры 8% ад заработнай платы. Апроч гэтага, у сталіцы пачнецца будаўніцтва сямейнага інтэрнату для лекараў. Адсутнасьць жытла — гэта галоўная перашкода, з-за якой лекары з рэгіёнаў ня могуць пераехаць у сталіцу.

### 50 тысяч подпісаў у абарону свабоды сумленьня

**Актывісты аргкамітэту па стварэньні Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі перадалі 50 тысяч подпісаў у адміністрацыю прэзыдэнта.**

Павал Севярынец і Аляксей Шэін, а таксама юрыст царквы “Новае жыцьцё” Сяргей Луканін перадалі подпісы асобаў, незадаволеных законам “Аб свабодзе сумленьня й рэлігійных арганізацый”. Раней подпісы былі перададзеныя ў Канстытуцыйны суд і Палату прадстаўнікоў.

Па словах Паўла Севярынца, закон рэпрэсіўны, ён не дае хрысьціянам свабодна маліцца й праводзіць эвангелізацыю.

## КУЛЬТУРА

### Падсумаваньне вынікаў конкурсу да 450-годзьдзя Льва Сапегі

**У Менску прайшло падсумаваньне вынікаў конкурсу школьных і студэнцкіх працаў да 450-годзьдзя канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі.**

Многія школьнікі пісалі на тэму эўрапейскай дзейнасьці вялікага канцлера. Адзін з экспэртаў конкурсу Юры Хадыка быў усьцешаны жаданьнем вялікае колькасьці маладзёнаў пісаць пра Сапегу.

"Школьнікі пісалі добрасумленна, з энтузіязмам, выкарыстоўваючы практычна ўсё, што ў нас апублікавана", — словы Юрыя Хадыкі прыводзіць інтэрнэт-выданьне газэты "Наша Ніва".

---

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.